*К 398(476.2-37Ветка)*
**А. Л. Даўжынец**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ФАЛЬКЛОРНАЯ СПАДЧЫНА ВЁСКІ СТАРОЕ СЯЛО ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню фактычных матэрыялаў, звязаных са святкаваннем Каляд і правядзеннем абраду пахавання стралы, які вядомы ў в. Старое Сяло пад назвай «сена». Аўтарам прааналізаваны мясцовыя асаблівасці вышэйназваных абрадаў, падрабязна разгледжаны звесткі пра абрад пахавання стралы. Выкарыстаны як апублікаваныя матэрыялы, так і уласна запісаныя, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.*

Фальклорна-этнаграфічная спадчына маёй роднай вёскі Старое Сяло Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці, як сведчаць фактычныя аўтэнтычныя матэрыялы, уключае такія абрады і звычаі (устойліва захоўваюцца і сёння ў народнай памяці), як Каляды, абрад пахавання стралы, радзінна-хрэсьбінныя абрады і песні. Падчас гутарак з мясцовымі жыхарамі пашчасціла запісаць, напрыклад, цікавыя звесткі пра тое, як у нашай мясцовасці святкавалі Каляды. Варта адзначыць, што аснову артыкула складаюць звесткі, запісаныя ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н., жыхаркі вёскі Старое Сяло. Паводле ўспамінаў інфарманта, «Каляды празнавалі калісь две нядзелі, танцавалі, гулялі» (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.). Усе калядныя вечары называлі ў нас «святымі вечарамі», таму забараняліся некаторыя віды гаспадарчай работы: «Маладзёж гуляла,



спраўлялі ігрышчы, гадалі, калядавалі, пелі шчодры. Нельзя было работаць, стукаць, резаць» (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.). Да святкавання Каляд рыхтаваліся надзвычай адказна: «Усё прыбіралі, мылі. Стол засцілалі святочным абрусам, пад яго клалі сена, ставілі гаршчок з куццёй, каб быў не голы, а багаты» (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.). Сена таксама трэба было пасцяліць і каля парога, «таго што Ісус Хрыстос радзіўся ў яслях і яго хавалі ў сене ад ірадаў. Каляды – бальшы празнік» (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.).

Арыгінальнай з‘явай каляндарна-абрадавага фальклору ў в. Старое Сяло з‘яўляўся абрад пахавання стралы, які называлі «Сена». Як адзначыла даследчыца В. С. Новак, «абрад пахавання

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стралы – спецыфічная адметнасць веснавой каляндарна-абрадавай паэзіі беларусаў, гэта рэгіянальная з‘ява, бо прэтэндуе на пэўную самастойнасць, аўтаномнасць. У гэтым плане як адметная з‘ява веснавога абрадавага фальклору Гомельшчыны адрозніваецца ад агульнабеларускай фальклорнай традыцыі» [1, с. 29]. Звернемся непасрэдна да апублікаваных і палявых экспедыцыйных матэрыялаў, уласна запісаных у вѐсцы Старое Сяло Веткаўскага раѐна.

Паводле сведчанняў інфармантаў, «адбываецца абрад на другі дзень Вялікадня, калі збіраюцца жыхары вѐскі ў супрацьлеглых канцах вуліцы і ідуць шарэнгамі насустрач адна адной. Спецыфічная прадметная атрыбутыка (у мужчын косы, у жанчын – граблі) пацвярджае семантычную скіраванасць абраду ў гэтай мясцовасці – забяспечыць добры сенакос» [1, с. 40-41]. Як адзначыла жыхарка в. Старое Сяло Абрамчук Валянціна Сяргееўна, 1963 г. н., «стралу вадзілі на Вялікдзень. Перад абрадам жанчыны збіраліся і праз усю вѐску ішлі, спявалі песні:

*Як пушчу стралу па ўсім сялу,*
*Да й уздоўж сяла ў канец вуліцы.*
*Як уб‘е страла добра моладца.*
*Па том моладцу некаму плакаці:*
*Матка старэнька, сястра маленька,*
*Дзеткі дробныя да й усе роўныя.*
*Жана малада кала горада.*
*Дзе матка плача –там рэчка цячэ,*
*Дзе сястра плача – там калодзезі,*
*Дзе дзеткі плачуць – ручайкі бягуць*» (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.).

Паводле ўспамінаў жыхароў вѐскі, «гэты звычай існуе ў нас для таго, каб у новым годзе расло новае, харошае сена. Збіраюцца людзі з



аднаго краю вѐскі і з другога і ідуць адны насустрач другім да сярэдзіны сяла. Мужчыны бяруць косы, вілы, ідуць першымі, жанчыны бяруць граблі» [1, с. 108]. Як вынікае з фактычнага матэрыялу, групы людзей, якія знаходзяцца ў розных баках вѐскі, выконваюць розныя песні пад назвамі «Страла» і «На сена» [1, с. 108-109].

Звесткі, запісаныя ад жыхаркі в. Старое Сяло Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н., праліваюць святло на семантыку мясцовага абраду пахавання стралы: «Абрад гэты водзяць, каб дождж пайшоў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

каб ураджай добры быў. Яшчэ абрад пахавання стралы людзей ад маланак і пажараў ахоўваў. Два гурты з розных канцоў вѐскі ішлі насустрач адзін аднаму, спявалі, а калі сустракаліся, то вадзілі карагод» (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.).
Адным з абавязковых прадметных атрыбутаў, што выкарыстоўваліся ў дадзеным абрадзе, маглі быць грошы, шпілька, лялька з саломы ці іншы прадмет. Пахаванне стралы асэнсоўвалася ў дадзеным выпадку як развітанне з вясною, невыпадкова ляльку, якую закопвалі, называлі «*вясна*». Пасля таго, як правялі цырымонію пахавання «ляльківясны», вадзілі карагоды, абходзячы вѐску і выконваючы песню:
*Ой хрэн, ты, мой хрэн, садавой, яравой*
*Ці не я цябе садзіў, ці не я палівав,*
*Селівонава жана пры дарозе жыла,*
*Русу косу часала, прыгаварывала:*
*«Ой расці мая каса да самога паяса,*
*Да самога паяса, да шырока сапага».*
*Як ехалі баяре семі горад гарадамі,*
*Як увідзелі дзевчонку,*
*Панаравілась, разрумянілась,*
*Ой, румяна, румяна, ой бялява, бялява* (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.).
Варта адзначыць, што карагод гэты водзяць некалькі разоў.
У працэсе яго выканання адбываецца дыялог паміж жанчынамі: «Цѐтка, цѐтка, хрэна даш?» , а тая ѐй адказвае: «Да ешчѐ малы, няхай падрасце!» (запісана ад Абрамчук Валянціны Сяргееўны, 1963 г. н.)
Асэнсаванне фактычнага матэрыялу дае магчымасць выявіць цікавыя лакальныя моманты. Напрыклад, лічылася, што чым большай будзе група людзей, што ўдзельнічаюць у дадзеным абрадзе, тым лепшым будзе сена: «Сено проводится обычно на 2-ой день Пасхі. Все собираются около дома культуры. Играет гармонь. Хоровод делится на две группы. Группы расходятся по разным сторонам. Одна группа идѐт на пески, а вторая – на Коноплѐвку. На плечах несут кто что –

косы, грабли, вилы. Чья группа будет большая, у того сено будет лучше» [1, с. 106].
Сярод адметных мясцовых рысаў абраду пахавання стралы ў в. Старое Сяло Веткаўскага раѐна варта вылучыць такі момант, як жартоўны «паядынак» паміж групамі, што водзяць карагоды:
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«А потым сустракаюцца і пачынаюць у жарт біцца, а тады размінаюцца і мяняюцца месцамі – гэтыя ідуць у той край, а тыя – у другі і пяюць тыя самыя песні. Абходзяць кругом вѐскі і на том жа месцы сустракаюцца. Там ужо танцы. Танцуюць спачатку «хрэна» і прыпяваюць: «Ой, хрэн, ты мой хрэн, яравой, садавой»«
[1, с. 110-111].
На пытанне, з якой мэтай водзяць сѐння абрад пахавання стралы, быў атрыманы наступны адказ: «Людзі, ўзяўшы адказнасць за правядзенне абраду, збіраюць вакол сябе аднавяскоўцаў і рушаць са спевамі і карагодамі ў жытняе поле. Ідуць туды, каб паяднацца з прыродай, роднай зямелькай і сонцам. Ідуць, каб заклікаць на палі ўрадлівыя дажджы, адвесці маланку ад вѐскі і падзякаваць Богу за жыццѐ, якое ѐн нам дарує».
Прыведзеныя матэрыялы дапаўняюць вядомыя матэрыялы па абраднасці пахавання стралы і пераконваюць, што невыпадкова гэта арыгінальная абрадавая з‘ява была ўключана ў спіс гісторыкакультурных каштоўнасцей нашай краіны.

**Спіс літаратуры**

1 Новак, В. С. Абраднасць і паэзія «пахавання стралы» / В. С. Новак. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2002. – 269 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ